Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі»

А. В. Кахноўская

# ЭТНАКУЛЬТУРНАЕ ВЫХАВАННЕ: ФАРМІРАВАННЕ АСНОЎ ПАТРЫЯТЫЗМУ Ў СТАРШЫХ ДАШКОЛЬНІКАЎ

Вучэбна-метадычны дапаможнік

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Мінск 2013

УДК 373.2:39(072)(=161.3)
ББК 74.100.5я7(4Беи)
К30

Рэкамендавана Рэдакцыйна-выдавецкім саветам
дзяржаўнай установы адукацыі
«Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі»

А ў т а р:
***А. В. Кахноўская,*** выкладчык кафедры педагогікі і псіхалогіі дашкольнай і пачатковай адукацыі ДУА «Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі»

Р э ц э н з е н т ы:
***А. Ч. Аляхновіч,*** кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт кафедры псіхалогіі і педагогікі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў;
***А. Т. Зяневіч,*** загадчык ДУА «Яслі-сад № 4» г. Мінска

**Кахноўская, А. В.**
К30 Этнакультурнае выхаванне: фарміраванне асноў патрыятызму ў старшых дашкольнікаў : вучэб.-метад. дапаможнік / А. В. Кахноўская ; ДУА «Мін. абл. ін-т развіцця адукацыі». – 2-е выд., выпраўл. – Мінск : Мін. абл. ІРА, 2013. – 100 с.
ISBN 978-985-7036-29-5.

Дапаможнік утрымлівае тэарэтычныя і практычныя матэрыялы па пытаннях этнакультурнага выхавання дзяцей старшага дашкольнага ўзросту. У выданні прадстаўлены пэўныя кірункі этнакультурнага выхавання дзяцей на аснове далучэння да гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа, а таксама практычныя матэрыялы (планаванне работы, прыкладны змест, канспекты заняткаў), якія дапамогуць педагогам арганізаваць работу па вышэйзгаданай праблеме.

Адрасавана педагогам устаноў дашкольнай адукацыі, настаўнікам пачатковых класаў, выхавальнікам устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, студэнтам, якія вучацца ў вышэйшых і спецыяльных навучальных установах па спецыяльнасці «Дашкольная адукацыя».

Першае выданне выйшла ў 2011 годзе пад назвай «Этнакультурнае выхаванне: фарміраванне асноў патрыятызму ў старэйшых дашкольнікаў».

**УДК 373.2:39(072)(=161.3)**
**ББК 74.100.5я7(4Беи)**

© Кахноўская А. В.
© Мін. абл. ІРА, 2013

**ISBN 978-985-7036-29-5**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# УВОДЗІНЫ

Актуальнасць праблемы этнакультурнага выхавання абумоўлена сукупнасцю фактараў навуковага, сацыяльнага і практычнага значэння. Яна вызначаецца у першую чаргу фарміраваннем і развіццём нацыянальнай самасвядомасці асобы ў новых умовах глабальных этнічных працэсаў.

Значнасць выхавання дзяцей у кантэксце этнічнай культуры абумоўлена сучаснымі тэндэнцыямі ў адукацыі, якія характарызуюцца ўзрослай цікавасцю да праблемы этнакультурнага выхавання падрастаючага пакалення. Этнакультурнае выхаванне дашкольнікаў сёння стала адным з актуальных кірункаў дашкольнай педагогікі і рэалізуецца ў многіх установах дашкольнай адукацыі рэспублікі.

Асноўны змест і задачы па этнакультурным выхаванні пазначаны Вучэбнай праграмай дашкольнай адукацыі [3]. Сістэма нацыянальнай адукацыі арыентавана на забеспячэнне ўмоў для гістарычнай пераемнасці пакаленняў, развіццё нацыянальнай культуры, выхаванне паважлівых і беражлівых адносін да культурна-гістарычнай спадчыны беларускага народа. Выхаванне дзяцей на аснове лепшых народных традыцый разглядаецца як умова захавання этнакультурнай самабытнасці, традыцыйнасці, ментальнасці, нацыянальных каштоўнасцей беларусаў. Вырашэнне дадзенай праблемы немагчыма без глыбокага пазнання традыцый і звычаяў, а таксама актывізацыі педагагічнай дзейнасці па далучэнні падрастаючага пакалення да традыцыйнай культуры этнаса.

Пытанні па этнакультурным выхаванні асобы закранаюць у сваіх работах вядомыя айчынныя даследчыкі народнай педагогікі: Г. П. Арлова, Г. А. Барташэвіч, Л. М. Варанецкая, А. А. Грымаць, Д. М. Дубініна, А. Ю. Лозка, Н. С. Старжынская і інш. У сваіх даследаваннях вышэйзгаданыя аўтары разглядаюць этнакультурнае выхаванне як актуальную сацыякультурную і педагагічную праблему.

Аналіз работы дашкольных устаноў і апытанне педагогаў паказалі, што ў рабоце па этнакультурным выхаванні яны час ад часу сутыкаюцца з пэўнымі цяжкасцямі. У сувязі з гэтым мы прапануем матэрыял, які, на нашу думку, дапаможа педагогам наладзіць эфектыўную работу па этнакультурным выхаванні старшых дашкольнікаў ва ўмовах дзіцячых садоў.

У аснову дапаможніка пакладзены адукацыйны комплекс «Этнакультурнае выхаванне старшых дашкольнікаў ва ўмовах дашкольнай установы», які распрацаваны ў ходзе даследавання, выкананага пад кіраўніцтвам доктара філасофскіх навук, прафесара В. У. Пазнякова. Мэта комплексу – развіццё пазнавальнай, эмацыянальна-каштоўнаснай, дзей-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

наснай сфер дзіцяці старшага дашкольнага ўзросту сродкамі этнічнай гісторыі і культуры беларусаў.

Адукацыйны комплекс складаецца з трох структурных кірункаў:

- сумесная дзейнасць педагога з дзецьмі;
- самастойная дзейнасць дзяцей;
- этнакультуратворчая сумесная дзейнасць дзяцей і дарослых (педагогаў, бацькоў).

Першы кірунак працы шляхам інтэграцыі розных відаў дзіцячай дзейнасці (зносіны, пазнавальная, практычная, мастацка-маўленчая, выяўленчая, гульнёвая, музычная) уводзіць дашкольніка ў этналагічную тэму, стварае ўмовы для набыцця ўяўленняў пра асаблівасці этнічнай культуры беларусаў. Другі кірунак дапамагае дзіцяці асэнсаваць успрыняты матэрыял, выпрацаваць пэўныя адносіны да яго шляхам самастойнай этнакультурнай дзейнасці. На трэцім этапе праз сумесную этнакультуратворчую дзейнасць ствараюцца ўмовы для пераасэнсавання і замацавання дзецьмі дашкольнага ўзросту ўспрынятага этналагічнага матэрыялу.

Базай рэалізацыі вышэйзгаданага адукацыйнага комплексу з'яўляюцца наступныя дзіцячыя сады Мінскай вобласці: яслі-сад № 2 г. Дзяржынска, дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці г. Дзяржынска, яслі-сад № 2 г. Фаніпаля, яслі-сады № 28, 36, 49, 47 г. Барысава.

Лічым, што прапанаваны матэрыял дапаможа педагогам знайсці адказы на пытанні па этнакультурным выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту, а таксама арганізаваць з большай эфектыўнасцю работу па дадзеным кірунку.

Жадаем вам поспехаў у далучэнні старшых дашкольнікаў да этнакультурнай спадчыны беларусаў як адной з умоў фарміравання асноў патрыятызму дзіцяці!

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Кодекс Республики Беларусь об образовании, 13 января 2011 г., № 243-3 // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2011. – № 13.2/1795.

2. Об утверждении образовательных стандартов дошкольного образования : постановление Министерства образования Республики Беларусь, 29 декабря 2012 г., № 146.

3. Об утверждении учебной программы дошкольного образования : постановление Министерства образования Республики Беларусь, 27 ноября 2012 г., № 133.

4. *Александровіч, Р.* Зямля з блакітнымі вачыма / Р. Александровіч, Т. Нескаромная. – 2-е выд. – Мінск : Беларусь, 2003. – 83 с.

5. *Арлова, Г. П.* Народная педагогіка : метад. дапаможнік / Г. П. Арлова, Т. Д. Вакушэнка, А. Л. Міхайлава. – Віцебск : ВДУ, 2006. – 168 с.

6. *Арлова, Г. П.* Праграма па этнавыхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту : вучэб.-метад. дапаможнік / Г. П. Арлова, Т. Д. Вакушэнка, С. П. Марзан. – Віцебск : ВДУ, 2004. – 193 с.

7. *Варанецкая, Л. М.* Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту : дыс. … канд. пед. навук : 13.00.07 / Л. М. Варанецкая ; Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка. – Мінск, 1997. – 133 с.

8. *Выготский, Л. С.* Воображение и творчество в детском возрасте: психологические очерки : книга для учителя / Л. С. Выготский. – 3-е изд. – М. : Просвещение, 1991. – 91 с.

9. *Грымаць, А. А.* Беларуская народная педагогіка: тэорыя і практыка / А. А. Грымаць, Л. М. Варанецкая. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 1996. – 191 с.

10. *Дубініна, Д. М.* Культура Беларусі ў казках і паданнях: этнакультурная адукацыя дашкольнікаў : дапам. для педагогаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашк. адукацыі / Д. М. Дубініна, Д. У. Дубінін. – Мінск : Зорны верасень, 2008. – 120 с.

11. *Дубініна, Д. М.* Родная прырода ў вуснай народнай творчасці : дапам. для педагогаў устаноў дашкольнай адукацыі / Д. М. Дубініна, А. А. Страха, Д. У. Дубінін. – Мінск : Нац. ин-т адукацыі, 2012. – 136 с.

12. *Захарова, Л. М.* Этнопедагогические технологии в дошкольном образовании / Л. М. Захарова // Начальная школа: плюс до и после. – 2009. – № 2. – С. 35–37.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ